# АКУПАЦЫЯ

**(10.07.1941-10.07.1944)**

***(Працяг. Пачатак у №№ 67-68, 76-77, 120, 123-124, 126, 130-131).***

Няшмат мы, тады 10-гадовыя хлопчыкі, разумелі ў гэтай вайне. Занадта шмат падзей адбылося, пачынаючы з 1939 года. Але бачанае на экране выклікала ў нас, незразумелыя можа нам самім, слёзы, крыўду, злосць. Так здаралася і са мною.

Але апладысменты ў кіназале паступова змаўкалі, калі «бліцкрыг» не атрымаўся, калі фашысты атрымалі першае паражэнне пад Масквой, калі ў Лунінецкі шпіталь паступілі абмарожаныя параненыя салдаты вермахта з-пад савецкай сталіцы.

Пасля выбуху партызанскай міны ў Мікашэвіцкім кінатэатры ў лістападзе 1942 года (тады загінулі больш як 200 акупантаў) у Лунінецкім адміністрацыя адмяніла сеансы «толькі для немцаў». Цяпер фільмы, калі былі жадаючыя з мясцовых, глядзелі «на роўных». Але і насельніцтва стала радзей хадзіць у кіно, нават хлопчыкі. Да таго часу ў свядомасці людзей шмат змянілася. На кіначасопісы «тыднёвай хронікі», дзе паведамлялася пра Сталінград ці Курск, лунінчан наогул не пускалі. Яны маглі ўвайсці ў залу толькі пасля іх дэманстрацыі. (Пасля разгрому фашысцкіх войскаў пад Сталінградам і палону фельдмаршала Паулюса ў Германіі быў аб'яўлены жалобны «дзень герояў». І ў Лунінцы былі прыспушчаны нямецкія флагі на флагштоках, на ўсіх іх былі прышпілены жалобныя чорныя стужкі).

У № 126 «ЛН» за 16.10 паведамляў пра знішчэнне так званых «выкрэстаў». Акупанты расстрэльвалі не толькі няўгодных ім людзей па расавых ці палітычных матывах. Знішчалі яны і душэўна хворых. У даваенным Лунінцы такіх было некалькі. Адныя сядзелі пастаянна дома, другія вольна хадзілі па горадзе, не ствараючы лунінчанам нязручнасцей. Самым вядомым душэўна хворым быў жыхар Брадзілаўкі (цяпер вуліца Сялянская) па імені Сцёпка і па мянушцы «пяць грошаў». Ён быў нявызначанага ўзросту, ціхім, не буяным, бяз-

спадніцах. У адну з нядзель невялікімі групкамі яны разышліся па горадзе, нешта здымалі, заходзілі ў царкву і касцёл, на могілкі (якіх тады ў Лунінцы было 4). Хутка прыезджыя пасябравалі з лунінецкімі маладымі людзьмі. Вясной 1942 года дружная кампанія немцаў і лунінчан накіравалася за раннімі кветкамі. У некалькіх кіламетрах за Вірам дрызіна падарвалася на міне (пра гэты выпадак мясцовыя партызаны не прыгадваюць). Ніхто не загінуў, але лёгкія раненні атрымалі і немцы, і лунінецкія дзяўчыны. Адна з іх пасля крыху кульгала (што не перашкодзіла ёй пасля вайны выйсці замуж за савецкага афіцэра).

У Лунінцы паявіліся нямецкія лакаматывы. Яны былі большымі за польскія і савецкія, відавочна – і магутнейшымі, па абодва бакі тэндэра – вялікія металічныя шчыты, кароткая труба, гудок, зусім не падобны на прывычны. Усе былыя работнікі дэпо атрымалі распараджэнне вярнуцца на работу. Салдаты чыгуначнага батальёна перашывалі асноўныя чыгуначныя пуці на станцыі. Яны сталі вужэйшымі за савецкія. Па іх хутка пайшлі не бачаныя ў нас нямецкія вагоны

сталявання нічога не засталося – усё было раскрадзена. Па двары валяліся дыяпазітывы, глобусы (імі нямецкія салдаты гулялі ў футбол), сарваныя са сцен партрэты кіраўнікоў СССР, геаграфічныя і палітычныя карты свету і СССР, шмат іншай школьнай маёмасці, неабходнай для вучобы, але не патрэбнай акупантам. Дырэктар школы прыклала шмат намаганняў, каб прывесці будынак і двор у парадак. З дапамогай бацькоў школьнікаў і прысланых управай рабочых ёй удалося зрабіць многае. У канцы верасня — пачатку кастрычніка прыступілі да заняткаў. Школу адкрылі з мітынгам, прамовамі, падзякамі «вызваліцелям». Але не было ні настаўнікаў, ні падручнікаў. Усе савецкія кнігі, якія былі куплены школай для агульнага карыстання ці прысланыя ў падарунак вучням Заходняй Беларусі з многіх гарадоў БССР і нават СССР, мастацкая літаратура са школьнай бібліятэкі ***(на здымку № 17 – штэмпель яе 1940 года)*** – усё было звалена ў кучу ў адзін з класаў і зачынена на ключ. Дырэктар Тулейка загадала нікога туды не пускаць. Нейкая камісія павінна была праверыць гэтыя кнігі і падручнікі і вырашыць, якімі

аднагодкамі стаць вучнем «прыватнай школы мадам Тулейка» і 4 разы на тыдзень вучыцца там за пэўную плату грашыма, садавінай і агароднінай. Так працягвалася каля паўгода.

У 1942 годзе акупанты адкрылі ў Лунінцы ўкраінскую школу. Размяшчалася яна ў драўляным доме – былой яўрэйскай сінагозе на вуліцы Прыпяцкая ***(на здымку 2)***. Выкладанне тут некаторых прадметаў вялося на ўкраінскай мове. У Лунінцы не было настаўнікаў, ведаючых яе, таму іх прыслалі з Заходняй Украіны. Гэта былі ярыя нацыяналісты, антысаветчыкі, русафобы. Нас навучалі заходняй гаворцы ўкраінскай мовы, якая адрозніваецца ад усходняй.

Памятаю, Пятро Максімільянавіч Івахно выкладаў нам украінскую мову з літаратурай і гісторыяй разам. У Роўна нават былі выпушчаны падручнікі для ўкраінскіх школ. Адзін з іх называўся «Кабзар» – нешта накшталт буквара, але для большага ўзросту, чым для першаклашак. На першай старонцы быў змешчаны партрэт Тараса Шаўчэнкі і яго верш пра Украіну. А вось далей... На малюнках з

дачка інспектара школы Людміла Васілевіч, дзеці сваякоў бургамістра Якубіка і некаторых іншых тагачасных начальнікаў. З імі «Падлец» паводзіў сябе ветліва і карэктна. У чэрвені-ліпені 1944 года Баброў некуды збег.

А вясной гэтага ж года акупанты закрылі ўкраінскую школу ў горадзе. Набліжаўся фронт. Некуды збеглі настаўнікі-украінцы, а немцы таксама спяшаліся, ім ужо было не да адукацыі «ніжэйшай расы».

Усе вучні-хлопчыкі былі мабілізаваны (менавіта так!) пад распіскі бацькоў і пераведзены на работу (не на вучобу!) у тэхнічную школу. Наведванне было абавязковым. Калі хто-небудзь не паяўляўся на занятках, за ім пасылаўся «бобік»-паліцэйскі. За неадназовую няяўку пагражаў арышт. Усе мы хлопчыкі – ад малога да вялікага – збівалі ў школе драўляныя скрыні з крышкай, у якой рабілася невялікая круглая адтуліна. Кіравалі работамі той жа Баброў і некалькі немцаў-сапёраў. Яны ж і вывозілі некуды дзённую выпрацоўку. Як потым высветлілі, скрыні былі прызначаны для ўзрывчаткі, дзіркі ў крышцы – для ўзрывальніка. Карацей кажучы, у тэхнічнай школе рабіліся ўпакоўкі для мін. Але праз тыдні тры работы скончыліся – у школу ўжо ніхто не хадзіў. А дырэктарам украінскай школы зноў была назначана Тулейка, якая і аб'явіла пра яе ліквідацыю.

Справядлівасці дзеля варта заўважыць, што сярод выкладчыкаў украінскай школы былі і прыстойныя людзі. Запомнілася ж вучоба больш шматлікімі інспекцыямі нямецкіх чыноўнікаў з Роўна і Пінска, якія размаўлялі па ўкраінску, апранутых у мундзіры гарчычнага колеру, са свастыкай на рукавах. Яны на нешта ўказвалі Тулейка, хадзілі па класах. Памятаю яшчэ урокі Закона Божага, якія вёў настаяцель царквы протаіерэй І. Бекіш. Хутчэй гэта былі не расказы пра біблейскія падзеі шматвекавой даўніны, а расповяд «пра божаскую місію немцаў-вызваліцеляў», ухваленне ўсяго таго, што робяць «на благо народа» новыя ўлады.

Нямецкія ўлады падзялілі вучняў у [illegible]






нушцы «пяць грошаў». Ён быў нявызначанага ўзросту, ціхім, не буяным, бязлобным. Яшчэ ў польскія часы сланяўся па горадзе, мог праследаваць прахожых, выпрошваючы ў іх грошы: «Паночку, дайце пяць грошаў». Атрымаўшы грошы, здымаў кепку, дзякаваў і нізка кланяўся. Менш ці больш не прасіў. Таму і атрымаў сваю мянушку. Ён чакаў пакупнікоў ля магазінаў, на базары, прапаноўваючы свае паслугі: паднесці цяжкія сумкі. Іншы раз яго бачылі ля вакзала, дзе прапаноўваў паднесці багаж пасажырам. Некаторыя баяліся Сцёпку. Некаторыя безбаязнена ўручалі яму свае сумкі, і ён ціха і пакорна нёс іх у любы канец горада. Многіх лунінчан ведаў па імёнах. Меў дзіўную паходку – з-за невялікай кулькавасці злёгку падскокваў. З ранняй вясны да позняй восені хадзіў басанож, зімой – у чаравіках без шнуркоў, ва ўсе часы года – у вялікай кепцы-васьміклінцы з паламаным вісячым казырком. Хлопчыкі, якім звычайна падабалася дражніць такіх людзей, да Сцёпкі адносіліся добразычліва. З ім адбываліся незвычайныя і нечаканыя гісторыі. Ён мог зайсці ў школу і стаяць моўчкі ў калідоры. Мог гадзінамі глядзець на паравозы з пешаходнага моста. У царкве стаяў на каленях, хрысціўся. На Вялікдзень любіў катаць яйкі з горкі і, зразумела ж, заходзіць у двары і віншаваць жыхароў са святам. У 1940 годзе міліцыянер (не мясцовы) арыштаваў Сцёпку за тое, што той залез на пустуючую трыбуну і, як казалі людзі, звярнуўся з прамовай. Падобныя гісторыі былі і ў гады акупацыі. Свае просьбы ён адрасаваў на польскай і на змешанай руска-беларускай мясцовай мове. Сцёпку ведалі ўсе лунінчане, ён быў нейкай часткай горада. Акупанты расстралялі яго.

У канцы верасня – пачатку кастрычніка 1941 года ў горадзе паявіліся нямецкія чыгуначнікі. У чорнай форме, круглых фуражках з какардай, на каўнярах у пятліцах з чырвоным кантам значкі – колы з крыльцамі. Сярод чыгуначных чыноўнікаў было некалькі жанчын у форме, з «нелунінецкімі» прычоскамі і ў кароткіх

гуначныя пуці на станцыі. Яны сталі вужэйшымі за савецкія. Па іх хутка пайшлі не бачаныя ў нас нямецкія вагоны.

Летам 1942 года за чыгуначнымі пуцямі (уздоўж вуліцы Гомельская) на Залессі немцы пачалі ўзводзіць сіламі савецкіх ваеннапалонных вялікі драўляны будынак – дэпо для рамонту вагонаў. Работы былі завершаны за кароткі тэрмін. Хутка ў дэпо рамантаваліся пашкоджаныя ў ваенных дзеяннях вагоны. Каб вялікі будынак са свежых дошак не быў прыкметны для савецкай авіяцыі, звонку дах і сцены пафарбавалі камуфляжнай жоўта-карычнева-зялёнай мазаікай. Будынак дзейнічаў да сярэдзіны 50-ых гадоў, пасля дэпо было зачынена і знесена.

У гады акупацыі станцыя Лунінец заставалася буйным чыгуначным вузлом, праз які праходзілі не толькі ваенныя эшалоны на ўсходні фронт і з фронта ў Германію. Быў наладжаны таксама рух пасажырскіх паяздоў. У нямецкай ваеннай літаратуры ўказваюцца маршруты ў межах генеральнага рэйхскамісарыята «Украіна», поезд № 8702 «Брэст-Літоўск-Лунінец», поезд № 0031 «Брэст-Літоўск-Лунінец-Здалбунаў», а таксама мясцовы поезд «Лунінец-Гарынь».

Восенню 1941 года гарадская ўправа аб'явіла, што ў школах Лунінца (агульнаадукацыйнай і тэхнічнай) пачынаюцца заняткі, што патрэбна прывесці памяшканні ў парадак (пасля захопу горада там размяшчаліся нейкія ваенныя арганізацыі, была казарма). Дырэктарам школы была прызначана лунінчанка Аляксандра Тулейка (пасля вайны за супрацоўніцтва з нямецка-фашысцкімі акупантамі яна была асуджана на 10 год выпраўленча-працоўных лагераў па сумна вядомым 58-ым артыкуле). Будынак школы знаходзіўся ў безнадзейным выглядзе. Многія вокны былі выбіты, разбураны паліўны склад, туалет, дапаможныя памяшканні, забруджаны двор, разбіты парты, пашкоджаны класныя чорныя дошкі, раскрадзена маёмасць. У даваенныя гады ў школе быў невялікі фізіка-хіміка-біялагічны кабінет. У ім меліся мікраскоп, электрычная машына, праекцыйны апарат з наборам шкляных дыяпазітываў па гісторыі Польшчы (захаваліся з польскага часу), а таксама савецкіх – аб паходжанні чалавека, флоры і фауне зямлі і іншыя. Ад аб-

лейка загадала нікога туды не пускаць. Нейкая камісія павінна была праверыць гэтыя кнігі і падручнікі і вырашыць, якімі можна карыстацца, якімі – не. Урокі ішлі без падручнікаў. У малодшых класах вяліся нейкія размовы, у старэйшых – нейкія запісы. Цяжкая гэта была вучоба.

Зачынены клас з кнігамі не даваў спакою многім вучням. Аказалася, што клас мае другія дзверы ў канцы калідора, заваленыя партамі. У нейкі момант чацвёрка школьнікаў – Міхаіл Колб, Аркадзь Ляшкевіч, Пажарыцкі і я вырашылі туды залезці і ўкрасці ў «Тулейчыхі» кнігі. Кожны з нас узяў каля 10-ці спадабаўшыхся экземпляраў. У мяне былі казкі Гауфа, том «Гісторыя артылерыі», рускія народныя казкі і быліны, аповесць «Хлопчык з Уржума» пра Кірава, «Палескія рабінзоны» Янкі Маўра і некалькі іншых. Тым жа шляхам мы пакінулі клас і праз акно вылезлі ў двор школы. Але аказалася, нехта бачыў, як мы неслі кніжкі дамоў, і данёс пра гэта. Нас выклікала дырэктар, насварылася і загадала прынесці кніжкі і прывесці бацькоў. Частку ўзятага мы вярнулі, перажылі дома непрыемнасці, але нас усё роўна выключылі са школы. Суцешыла толькі тое, што праз 2-3 тыдні школа была закрыта, а ў будынку зноў размясціліся нейкія ваенныя ўстановы, казарма і г.д. Маёмасць школы (у тым ліку і ўсе кнігі) была выкінута ў двор і паступова спалена.

Я вярнуў не ўсе кнігі. Яшчэ доўга ў хатняй бібліятэцы знаходзіліся і дзве першыя з вышэй згаданых, і шмат разоў прачытаныя «Незвычайныя прыгоды Карыка і Валі».

Ненавісная намі дырэктарша Тулейка нядоўга засталася без работы. Яна арганізавала школьныя заняткі на даму ў дзве змены. На вуліцы 17 Верасня ў яе валоданні былі два дамы. У адным і была арганізавана школа. За навучанне арыфметыцы, рускай мове, пачатковай алгебры, геаметрыі і некаторым іншым прадметам (для дзяўчынак – кройкі і шыцця, вязання і асновам дамаводства) трэба было плаціць ці карбаванцы, ці больш устойлівую валюту – рэйхсмаркі, але можна было і прадуктамі. Нягледзячы на нядаўні інцыдэнт з крадзяжом кніг і высвятленнем адносін з Тулейка, мае бацькі (яны былі знаёмыя яшчэ з польскіх часоў) вырашылі, што я павінен наведваць гэтую школу – якая ні ёсць, а ўсё ж адукацыя. Прыйшлося мне разам з 15-20

рэт Тараса Шаўчэнкі і яго верш пра Украіну. А вось далей... На малюнках з подпісамі на ўкраінскай мове была паказана гісторыя Германіі ў саюзе з Украінай пад лозунгам: два народы – адзін лёс. Праслаўлялася дзейнасць нямецкіх улад на Украіне, ухваляўся «вызваліцель» «ад большевікиў і жидіў-комисароў» Гітлер і яго паплечнікі, нямецкая армія. У гэтай кнізе было шмат вершаў. «Пан Петро» прымушаў нас вучыць на памяць прысвячэнні рэйхскамісару Украіны Эрыху Коху. Зразумела, на ўкраінскай мове. За няведанне «пан Петро» лупіў нас драўлянай тоўстай лінейкай па галаве, спіне, прымушаў стаяць увесь урок па стойцы «смірна». Памятаю нейкія ўрыўкі: што для ўсіх нас прыйшла лепшая доля таму, што «е тепер на господарстві пан вельможні, добрый Кох», што ён «зная край і вдоль і в ширкі і кому якая бэда», што са сваёй бядой можаш ісці да Коха, што «ўсіх прыймае пан ласкавы, трэба тількі молвіць «ох». Вось такі добры «пан Кох». Ён клапоціцца пра ўсіх – ад немаўляці да старога. Кох на Украіне ад Бога. Вось такія вершы. Падобныя былі і пра Гітлера.

Яшчэ адзін настаўнік украінскай школы любіў здзекавацца над вучнямі. Ён выкладаў нешта накшталт працы. Вучыў сталярнай і слясарнай справе, усялякім гаспадарчым навыкам. У дзяўчынак была свая настаўніца па дамаводству і навучанню на сакратар-машыністку. Немцам жа патрабаваліся не вельмі адукаваныя людзі ніжэйшай расы. Лік да 1000, 4 арыфметычныя дзеянні, уменне штосьці прачытаць, распісацца, ведаць нешта пра Германію – і ўся навука. Іншая справа – умець рабіць гаспадарчыя дзеянні, умець працаваць на паноў. Гэтаму нас і вучыў настаўнік Баброў. Сам ён лунінецкі, доўгі час выкладаў у тэхнічнай школе. І ў польскі час вызначаўся крутым норавам. Цяпер жа ва ўкраінска-нямецкай школе ён стаў яшчэ больш злым і лютым. Пастаянна хадзіў з дубовай лінейкай. Мог за нішто сказаць: «Дай, дрэнь, лапу!» і тут жа на далонь вучня абрынуць град удараў лінейкай. Рука распухала, балела страшна, а Баброў казаў, што толькі так можна навучыць «наша быдла» ўменню працаваць. Вучні далі яму мянушку «Падлец». Зразумела, адносіўся ён так не да ўсіх. Разам з намі вучыліся

блага народа» новыя ўлады.

Нямецкія ўлады падзялілі вучняў у школе на праваслаўных і каталікоў і выкладанне так званага Закона Божага вялося раздзельна. Дарэчы, і праваслаўныя, і каталіцкія ўрокі наведваў адзін і той жа прыезжы чыноўнік у форме з аддзела школ Пінскага камісарыята. У класах школы былі абавязковымі партрэты Гітлера і Коха, а ў вестыбюлі (калі так можна назваць вузенькі калідорчык перабудаванай сінагогі), акрамя партрэтаў фюрэраў, абавязковы быў і фашысцкі флаг са свастыкай. У школе перыядычна вывешвалі фотаздымкі «з жыцця нямецкай моладзі» – парады, злёты, адпачынак, фізкультурныя заняткі, вучобы, сельгасработы, турызм і т.п. членаў маладзёжнай арганізацыі «Гітлерюгенд», а таксама разнастайныя агітацыйныя лісткі і газеткі на ўкраінскай мове.

У гады акупацыі не спынялася работа царквы і касцёла. Адзначаліся ўсе рэлігійныя святы. І нават на велікодны начны хрэсны ход вакол царквы і богаслужэнне камендант горада даваў дазвол. Лунінецкія свяшчэннікі былі ў добрых адносінах з новай уладай. Калі адбываліся нейкія сходы ці мітынгі, на іх абавязкова прысутнічалі і Бекіш, і айцец Мікалай (не памятаю прозвішча). У сваіх выступленнях яны заўсёды асуджалі Савецкую ўладу і «антыхрыстаў-бальшавікоў». У 1944 годзе гэтыя свяшчэннікі пакінулі Лунінец разам з адступаючымі немцамі.

Зімой 1941 ці 1942 года я паступіў у царкву прыслужнікам. Дапамагла маці школьнага сябра Толькі Вачулы – Вольга, пеўчая царкоўнага хору. Другая спяваючая славутасць Лунінца пасля Сімы Бесан. Да верасня 1939 года сям'я Вачула жыла ў вялікім драўляным уласным доме, пабудаваным на пляцы, купленым у землеўладальніка Аляшкевіча. Дом стаяў у глыбіні вялікага сада, меў вадзяную калонку (помпу), што ў даваенны час лічылася вельмі прэстыжным (гэты дом стаіць і цяпер на вуліцы Міра – пасля вайны ў ім жыла сям'я наменклатурнага партыйнага работніка Казімірава).

**Л. КОЛАСАЎ.**

**Працяг будзе.**